**Гоўзіч І.М.**

# Глебка Пятро

**Глебка Пятро (Пётр Фёдаравіч) (1905—1969)** — паэт, дзіцячы пісьменнік, перакладчык,драматург, вучоны, грамадскі дзеяч.

Нарадзіўся 06. 07. 1905 г. у вёсцы Вялікая Уса (цяпер Уздзенскі раён Мінскай вобласці) у сялянскай сям'і. Пасля заканчэння уздзенскай сямігодкі (1923) спрабаваў пастуціць у БДУ, але няўдала, паступае ў Белпедтэхнікум (1924), з якога пераводзіцца на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта БДУ (1927—1930). Асаблівы ўплыў на П. Глебку зрабілі гады вучобы ў Белпедтэхнікуме, дзе вучыліся А. Александровіч, П. Трус, М. Лужанін, А. Якімовіч і інш.). У 1925 г. П. Глебка ўступае ў літаратурна-мастацкае аб'яднанне "Маладняк", у 1926 г. становіцца членам літаратурна-мастацкага аб'яднання "Узвышша". Пасля заканчэння універсітэта (1930) П. Глебка працаваў загадчыкам літаддзела ў газеце «Калгаснік Беларусі», у часопісе «Полымя рэвалюцыі». У 1934—1936-х гг. займаў пасаду кансультантам па паэзіі ў СП БССР. У 1941—1942-х гг. служыў у Чырвонай Арміі (працаваў у рэдакцыях франтавых газет "За Савецкую Беларусь", "За свабодную Беларусь"). Пад псеўданімам Язэп Касіла друкаваў сатырычныя творы ў агіт-плакаце "Раздавім фашысцкую гадзіну" і ў "Партызанскай дубінцы". У 1943—1945-х гг. — рэдактар выдавецтва ЦК КП(б)Б "Савецкая Беларусь", галоўны рэдактар Дзяржаўнага выдавецтва БССР у Маскве. З 1944 г. кіруе групай па складанні "Руска-беларускага слоўніка" (1953). З 1945 г. працаваў у Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР, з 1952 г.займае пасаду загадчыка сектара лексікаграфіі, з 1956 г. — дырэктар Інстытута мовазнаўства, з 1957 г. — дырэктар інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. У 1955—1967 з'яўляўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, у 1968—199-м гг. быў акадэмікам-сакратаром Аддзялення грамадскіх навук, удзельнічаў у рабоце сесій Генеральнай Асамблеі ААН (1955, 1956, 1957, 1964). Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга і іншымі ордэнамі і медалямі. Памёр 18. 12.1969 г .у Маскве, пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

У 1925 г. у газетах і часопісах "Беларуская вёска", "Савецкая Беларусь", "Работніца і сялянка", "Беларускі піянер" былі апублікаваны першыя вершы П. Глебкі. У 1928—1930-х гг. — сакратар рэдакцыі часопіса "Узвышша". Першы зборнік П. Глебкі — "Шыпшына" (1927) — узор лірычнай паэзіі, сведчанне яго самабытнага таленту. Тэма кахання стала адным з важных сродкаў самавыяўлення П. Глебкі. У наступных зборніках паэзіі "Урачыстыя дні" (1930), "Хада падзей" (1932), "Чатыры вятры» (1935), "Мужнасць" (1938) адлюстравалася атмасфера літаратурнага і грамадскага жыцця 1930-х гг. Лірыка ваеннага часу засведчыла паэтычны талент П. Глебкі (вершы "Партызаны", "Смерць салдата", "Родны хлеб", "Пасылка", "Жывое слова", "Беларусі", "Зварот" і інш.). асноўная тэма пасляваеннай творчасці — аднаўленне гарадоў і вёсак, памяць вайны. Аўтар вершаў для

дзяцей, драматычнай паэмы, лібрэта да опер і вершаванай драмы. Перакладаў з рускай і ўкраінскай моў.

Стылю П. Глебкі ўласцівы публіцыстычнасць і грамадзянская страснасць, лірызм і палемічнасць.

**Літаратура**


Глебка Петр Федорович // Национальная академия наук Беларуси: персональный состав. 3-е изд., доп. и перераб. — Минск, 2003. — С. 45—46.

Беларускія пісьменнікі (1917—1990) : даведнік / Склад. А.К. Градзіцкі. — Мінск, 1994.

Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўн.: у 6 т. — Мінск, 1993. — Т. 2. — С. 210-224.

Ліс, А.С. Пятро Глебка/ А.С. Ліс // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. — Мінск, 2003. —Т.4, кн.2. — С. 224—247.

Фядосік, А.С. Пятро Фёдаравіч Глебка / А.С. Фядосік // Весці АН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. — 1995. — № 2.— С. 124—126.